Дадатак 2

АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАЎ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

1. Рэалізацыя выхаваўчага патэнцыялу вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»

З мэтай рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу вучэбнага прадмета «**Беларуская мова»** рэкамендуецца выкарыстоўваць:

лінгвакультуралагічны аналіз нацыянальна маркіраваных моўных адзінак, звязаны з выяўленнем іх сімвалічных значэнняў, высвятленнем этымалогіі і раскрыццём унутранай формы слоў, фразеалагізмаў, прыказак, прымавак, параўнанняў;

складанне асацыятыўных палёў са словам, фразеалагізмам, паходжанне якіх звязана з гісторыяй, культурай і менталітэтам беларускага народа;

экстралінгвістычны каментарый або лінгвакультуралагічны аналіз тэкстаў, у якіх раскрываюцца факты духоўнай і матэрыяльнай культуры беларускага народа: традыцыі, мараль, побыт, жыццёвая філасофія, каштоўнасці, дзяржаўныя і нацыянальныя сімвалы і інш.;

вусныя і пісьмовыя выказванні вучняў на грамадзянска-патрыятычныя, маральна-этычныя тэмы (выхаваўчы аспект рэалізуецца ў самавыяўленні вучняў у працэсе стварэння імі ўласных арыгінальных тэкстаў у вуснай і пісьмовай формах);

міжпрадметныя сувязі беларускай мовы з літаратурай і іншымі вучэбнымі прадметамі, пры гэтым акцэнтаваць увагу на ідэях, якія фарміруюць патрыятызм і грамадзянскасць.

Патрыятычнае выхаванне на ўроках беларускай мовы рэалізуецца праз прывіццё любові і павагі, свядомага стаўлення да мовы як духоўнай каштоўнасці, сродку зносін і атрымання ведаў у розных сферах чалавечай дзейнасці. Асаблівай увагі патрабуе фарміраванне ўсвядомленага ўспрымання вучнямі беларускай літаратурнай мовы як сродку замацавання традыцый, маральных ідэалаў грамадства, пачуцця прыгажосці, мілагучнасці, выразнасці, эстэтычнай вартасці беларускай мовы.

У змесце вучэбнага прадмета «Беларуская мова» ў найбольшай ступені на дасягненне асобасных адукацыйных вынікаў арыентаваны тэмы («Мова – найважнейшы сродак зносін», V клас; «Беларуская мова – нацыянальная мова беларускага народа», VI клас; «Валоданне літаратурнай мовай – асноўны паказчык культуры чалавека», VII клас; «Роля беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры», VIII клас і інш.), а таксама

раздзелы «Маўленне», «Тэкст», «Стылі маўлення», «Культура вуснага і пісьмовага маўлення».

Для рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу вучэбнага прадмета «**Беларуская літаратура»** ў працэсе работы з мастацкім творам прапануецца выкарыстоўваць:

заданні, арыентаваныя на практычную дзейнасць і сувязь са штодзённым жыццём (параўнальны аналіз пейзажных карцін у мастацкім творы і навакольнай прыроды; ліст ветэрану, заснаваны на ўражанні аб вывучаным творы пра Вялікую Айчынную вайну; дыспут пра маральны выбар герояў твораў; стварэнне інтэрнэт-старонак, прысвечаных памятным падзеям, апісаным у літаратурных творах);

заданні, якія дазваляюць звязаць матэрыял, што вывучаецца, з асабістым сацыяльным вопытам і ўяўленнямі пра паводзіны людзей у грамадстве (інсцэніраванне фрагментаў мастацкіх твораў з наступным абмеркаваннем; стварэнне альтэрнатыўных сюжэтных ліній, фіналаў твораў з улікам змен у характары герояў, іх учынках; літаратурныя віктарыны, эстафеты, конкурсы; падрыхтоўка літаратурнай экскурсіі);

заданні, накіраваныя на выяўленне асобасных адносін вучняў да мастацкага твора, яго герояў (маляванне героя, падбор ілюстрацый, стварэнне вокладкі для кнігі, дзённікавых запісаў героя, падрыхтоўка эмацыянальнай партытуры настрою героя, складанне дыягнастычнай карты паводзін героя і інш.);

інтэрактыўныя формы работы: дыскусіі, ролевыя гульні, іншыя.

Пры вывучэнні мастацкіх твораў, у якіх расказваецца пра пакуты людзей на вайне («Васількі» Міхася Лынькова, «Над спаленай вёскай…» Аркадзя Куляшова і інш.), а таксама пры правядзенні пазакласнай работы па вучэбным прадмеце неабходна звяртаць увагу на праблему **генацыду** беларускага народа з апорай на гісторыі ўласных сем’яў вучняў, дакументальныя факты (напрыклад, «Хатынскі спіс», кнігі серыі «Памяць»).

Улічваючы вялікі выхаваўчы патэнцыял экскурсій, значную колькасць экскурсійных аб’ектаў і турыстычных маршрутаў мясцовага значэння, пры арганізацыі адукацыйнага працэсу рэкамендуецца выкарыстоўваць гэту форму работы (зыходзячы з прынцыпу тэрытарыяльнай даступнасці).

2. Вучэбныя праграмы

Звяртаем увагу, што ў сувязі з выключэннем у X–XI класах (базавы і павышаны ўзроўні) навучальных сачыненняў з пераліку абавязковых пісьмовых работ, на напісанне якіх адводзяцца асобныя ўрокі, у вучэбныя праграмы ўнесены наступныя змены.

Па вучэбным прадмеце **«Беларуская мова»**:

X клас (базавы ўзровень) – 51 гадзіна на год, з іх 9 (замест 15) гадзін на пісьмовыя кантрольныя і навучальныя работы.

XI клас (базавы ўзровень) – 51 гадзіна на год, з іх 9 (замест 15) гадзін на пісьмовыя кантрольныя і навучальныя работы.

X клас (павышаны ўзровень) – 102 гадзіны на год, з іх 13 (замест 19) гадзін на пісьмовыя кантрольныя і навучальныя работы.

XI клас (павышаны ўзровень) – 102 гадзіны на год, з іх 13 (замест 19) гадзін на пісьмовыя кантрольныя і навучальныя работы.

Вызвалены вучэбны час мэтазгодна размеркаваць для паўтарэння, абагульнення і сістэматызацыі вывучанага матэрыялу, падрыхтоўкі да выпускнога экзамену.

Па вучэбным прадмеце **«Беларуская літаратура»:**

X клас (базавы ўзровень) – 51 гадзіна на год, з іх: на вывучэнне твораў – 46 гадзін (замест 44); на кантрольнае сачыненне – 4 гадзіны; на ўрокі па творах для дадатковага чытання – 1 гадзіна («Кузьма Чорны» – 5 гадзін (замест 4); «Іван Мележ» – 5 гадзін (замест 4)).

XI клас (базавы ўзровень) – 51 гадзіна на год, з іх: на вывучэнне твораў – 46 гадзін (замест 44); на кантрольнае сачыненне – 4 гадзіны; на ўрокі па творах для дадатковага чытання – 1 гадзіна («Іван Шамякін» – 5 гадзін (замест 4); «Сучасная проза» – 5 гадзін (замест 4)).

X клас (павышаны ўзровень) – 102 гадзіны на год, з іх: на вывучэнне твораў – 91 гадзіна (замест 87); на кантрольнае сачыненне – 8 гадзін; на ўрокі па творах для дадатковага чытання – 2 гадзіны; рэзерв вучэбнага часу – 1 гадзіна («Кузьма Чорны» – 7 гадзін (замест 5); «Іван Мележ» – 7 гадзін (замест 5)).

XI клас (павышаны ўзровень) – 102 гадзіны на год, з іх: на вывучэнне твораў – 91 гадзіна (замест 87); на кантрольнае сачыненне – 8 гадзін; на ўрокі па творах для дадатковага чытання – 2 гадзіны; рэзерв вучэбнага часу – 1 гадзіна («Іван Шамякін» – 9 гадзін (замест 8); «Васіль Быкаў» – 11 гадзін (замест 10); «Уладзімір Караткевіч» – 8 гадзін (замест 7); «Сучасная проза» – 9 гадзін (замест 8)).

У **IX класе** па вучэбным прадмеце **«Беларуская літаратура»** ў вучэбную праграму ўнесены наступныя змены:

IX клас – 51 гадзіна на год, з іх 42 гадзіны (замест 43) на вывучэнне твораў; на навучальныя сачыненні – 3 гадзіны; на кантрольнае сачыненне – 2 гадзіны; рэзерв вучэбнага часу – 2 гадзіны (замест 1) («Ян Баршчэўскі» – 1 гадзіна (замест 2), 1 гадзіна перанесена ў рэзерв вучэбнага часу. У спіс для дадатковага чытання ўключана апавяданне Расціслава Бензерука «Бацькава скрыпка»).

3. Вучэбныя выданні

Да 2026/2027 навучальнага года перавыдадзены з улікам вынікаў вопытнай праверкі, дыялогавых пляцовак, грамадскай экспертызы вучэбны дапаможнік

Праскаловіч, В. У. Беларуская літаратура : вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання / В. У. Праскаловіч [і інш.]; пад рэд. В. У. Праскаловіч, С. У. Калядка. – Мінск : Акадэмія адукацыі, 2026.

Пры падрыхтоўцы да перавыдання ў змест вучэбнага дапаможніка ўнесены наступныя змены: скарочана колькасць абавязковых для вывучэння апавяданняў Яна Баршчэўскага; узмоцнены выхаваўчы патэнцыял: дапоўнены культуразнаўчай інфармацыяй, якая садзейнічае выхаванню ў вучняў павагі да Радзімы, фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці, грамадзянскасці, патрыятызму, сістэмы маральна-этычных якасцей, паважлівага стаўлення да сямейных каштоўнасцей, павагі да гістарычнага мінулага і стваральнай працы на карысць беларускай дзяржавы.

4. Вывучэнне вучэбнага прадмета ў ліцэі

Інфармацыя пра размеркаванне вучэбных гадзін па раздзелах для вывучэння вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» на базавым і павышаным узроўнях размешчана на нацыянальным адукацыйным партале: *https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2026/2027 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы / Беларуская мова*, *Беларуская літаратура*.

Звяртаем увагу, што ў сувязі з выключэннем у X–XI класах (базавы і павышаны ўзроўні) навучальных сачыненняў з пераліку абавязковых пісьмовых работ, на напісанне якіх адводзяцца асобныя ўрокі пры вывучэнні вучэбных прадметаў «Беларуская мова», «Беларуская літаратура», вызвалены вучэбны час мэтазгодна размеркаваць на найбольш складаныя тэмы для паўтарэння, абагульнення і сістэматызацыі вывучанага матэрыялу.

5. Асобныя аспекты арганізацыі адукацыйнага працэсу (у тым ліку па выніках ЦЭ, Нацыянальнага даследавання якасці адукацыі)

Рэкамендуецца сістэматычна арганізоўваць навучанне вучняў напісанню падрабязнага пераказу ў V–IX класах і выкананню тэставых работ у VIII–XI класах на працягу ўсяго навучальнага года, а таксама выкарыстоўваць з гэтай мэтай рэзервовыя гадзіны.

Метадычныя рэкамендацыі па напісанні падрабязнага (навучальнага, кантрольнага) пераказу па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале:

https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2026/2027 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Метадычныя рэкамендацыі, указанні.

Метадычныя рэкамендацыі па складанні і ацэньванні тэставых работ і спасылка на адкрыты банк тэставых матэрыялаў па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: *https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2026/2027 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Метадычныя рэкамендацыі, указанні.*

Звяртаем увагу, што да 2026/2027 навучальнага года перавыдадзены «Зборнік матэрыялаў для выпускнога экзамену па вучэбным прадмеце “Беларуская мова” за перыяд навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Тэксты для пераказу». З мэтай узмацнення выхаваўчага патэнцыялу змест зборніка абноўлены.

З мэтай павышэння вынікаў цэнтралізаванага экзамену (далей – ЦЭ) па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» мэтазгодна выкарыстоўваць заданні з элементамі аналізу, заснаванага на супастаўленні слоў розных часцін мовы і іх напісання, на ўменні аналізаваць марфемную будову слова і спосаб утварэння, тлумачыць правапіс слова на словаўтваральным узроўні (асабліва ў выпадках, калі напісанне не адпавядае вымаўленню). Пры паўтарэнні сінтаксісу неабходна развіваць у вучняў уменні разглядаць функцыянаванне моўнай адзінкі з улікам семантыкі і сінтаксічнай сувязі слоў, бачыць пэўную сінтаксічную мадэль у сказах з розным лексічным напаўненнем, суадносіць сінтаксічную будову сказа з пунктуацыйным правілам.

Асаблівай увагі патрабуюць заданні, у якіх патрэбна прымяніць веды з аднаго раздзела (тэмы) для рашэння задач, звязаных з іншым раздзелам (сумежнай тэмай): напрыклад, вызначыць прыстаўку ці корань слова, каб правільна напісаць патрэбную арфаграму; вызначыць прыналежнасць слова (слоў) да пэўнай часціны мовы, каб правільна напісаць *не* са словам і іншыя.

Рэкамендуецца выкарыстоўваць заданні, розныя па форме, моўным змесце, узроўні складанасці, накіраваныя на развіццё вучэбных уменняў вучняў: работа са схемамі, устанаўленне адпаведнасці, выяўленне прычынна-выніковых сувязей, тлумачэнне арфаграм / пунктаграм і іншыя.

Для сістэматызацыі ведаў і ўменняў вучняў рэкамендуецца выкарыстоўваць вучэбную праграму факультатыўных заняткаў «Беларуская мова: падагульняльны курс» для XI класа. Вучэбная праграма размешчана на нацыянальным адукацыйным партале: *https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2026/2027 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы / Беларуская мова*, *Беларуская літаратура*.

З мэтай фарміравання функцыянальнай адукаванасці мэтазгодна ўключаць у адукацыйны працэс заданні, накіраваныя:

на трактоўку вучнямі інфармацыі аб аб’екце, прыведзенай у тэкставай або графічнай форме;

выяўленне падобных і адрозных уласцівасцей аб’екта ці з’явы;

устанаўленне падабенства (аналогіі) малавывучанага аб’екта з добра вядомым аб’ектам у форме гіпотэзы;

фарміраванне ўменняў фармуляваць вывады на аснове прыведзеных звестак;

знаходжанне шляхоў вырашэння праблемных жыццёвых сітуацый;

пошук, атрыманне, інтэрпрэтацыю, пераўтварэнне, ацэнку і крытычнае асэнсаванне інфармацыі і іншае.